**ВІ́ДЗАЎСКІ КАСЦЁЛ НАРАДЖЭ́Н-НЯ ДЗЕ́ВЫ МАРЫ́І**, помнік архітэктуры неаготыкі ў г.п. Відзы Браслаўскага р-на. Пабудаваны ў 1904—14 з чырвонай цэглы на месцы папярэдняга храма 1481. Гал. фасад 3-нефавай базілікі з трансептам, 5-граннай апсідай і 2-павярховымі бакавымі сакрысціямі фланкіруюць 2 вежы (выш. 59 м) з 8-граннымі шатрамі ў завяршэнні. Перспектыўны партал са стральчатым абрысам арак тымпана завершаны вімпергам з пінаклямі па баках. Стральчатыя формы вітражных аконных праёмаў гал. і бакавых фасадаў дубліруюць аркі партала. Дынамізм форм ствараецца складаным рытмам архіт. элементаў: пінакляў, зубчастых трохвугольных шчытоў гал. фасада і трансепта, ступеньчатых контрфорсаў, стральчатых ніш. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Касцёл дзейнічае.

*Ю.Ю.Захарына.*



*Відзаўскі касцёл Нараджэння Дзевы Марыі.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ